# *§17-0. Грамадска-палітычная барацьба ў Беларусі напачатку XX ст.

БУНД РСДРП
БСГ РЭВАЛЮЦЫЯ
КРЫВАВАЯ НЯДЗЕЛЯ
КУРЛОЎСКІ РАССТРЭЛ
ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА
КАДЭТЫ АКЦЯБРЫСТЫ
МАНІФЕСТ 17 КАСТРЫЧНІКА

Першыя палітычныя партыі на тэрыторыі Беларусі

Як вы лічыце, з чым звязанае з'яўленне на тэрыторыі Беларусі напачатку XX ст. нацыянальных палітычных партый?

**1. Узнікненне палітычных партый.** Пашырэнне сацыялістычнай ідэалогіі абумовіла змены ў формах рэвалюцыйнага руху ў Расійскай імперыі. На мяжы XIX–XX стст. на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца палітычныя партыі. Ад самага пачатку сваёй дзейнасці тут праяўлялі актыўнасць Польская сацыялістычная партыя (ПСП) і Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя, якія галоўнае месца адводзілі вырашэнню нацыянальнага пытання, але не на карысць беларусаў.

**Палітычныя партыі рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку ў Беларусі**

| Назва | Дата ўтварэння | Кароткая характарыстыка | Задачы партыі |
|---|---|---|---|
| Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд) | 1897 г. | Найбуйнейшая сацыял-дэмакратычная арганізацыя Расійскай імперыі. Напачатку XX ст. арганізацыі Бунда дзейнічалі практычна ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі | Абарона інтарэсаў яўрэйскіх рабочых |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (РСДРП) | 1898 г. | Неўзабаве пасля стварэння ў выніку арыштаў РСДРП страціла кіраўнікоў цэнтральных органаў, што выклікала часовую дэзарганізацыю. Дзейнасць партыі аднавілася толькі ў 1903 г. У канцы 1903 — пачатку 1904 г. групы РСДРП з'явіліся ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Барысаве і інш. | Найбліжэйшыя задачы: звяржэнне самадзяржаўя, усталяванне дэмакратычнай рэспублікі. Канчатковая мэта — пралетарская рэвалюцыя, пабудова сацыялізму |
| Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэры) | 1902 г. | На тэрыторыі Беларусі знаходзіўся адзін з асноўных цэнтраў партыі. Партыя лічыла індывідуальны палітычны тэрор эфектыўным спосабам палітычнай дзейнасці | Шырокія палітычныя правы і свабоды, звяржэнне самадзяржаўя, усталяванне федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі ў Расіі. Сацыялізацыя зямлі, што мела ўмовай адмену прыватнай уласнасці на зямлю і перадачу яе ў распараджэнне органаў самакіравання, ураўняльнае землекарыстанне |
| Беларуская рэвалюцыйная грамада (БРГ). Ад снежня 1903 г. — Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ) | 1903 г. | Стваральнікамі і лідарамі былі браты Антон і Іван Луцкевічы, А. Пашкевіч (Цётка) і інш. У снежні 1903 г. адбыўся I з'езд партыі, дзе яна характарызавалася як сацыяльна-палітычная арганізацыя беларускага працоўнага народа | Звяржэнне самадзяржаўя, усталяванне дэмакратычнай рэспублікі, права народаў Расіі на аўтаномію. Аграрная праграма партыі была ў асноўным запазычана ў эсэраў |

Якія пласты насельніцтва Беларусі былі сацыяльнай базай згаданых палітычных партый? Што аб'ядноўвала партыі рэвалюцыйна-дэмакратычнай накіраванасці? Чым яны адрозніваліся?

У гады першай расійскай рэвалюцыі ўзніклі розныя партыі, саюзы, арганізацыі. У Беларусі з'явілася такая кансерватыўная палітычная сіла, як чарнасоценцы — крайне правыя арганізацыі і гурткі, якія выступалі за захаванне манархічнай улады. Для іх ідэалогіі быў характэрны вялікадзяржаўны шавінізм і антысемітызм. Першыя чарнасоценныя арганізацыі

Успомніце, што такое шавінізм.

былі нешматлікія, аднак неўзабаве яны пашырылі сваю дзейнасць дзякуючы падтрымцы ўлад.

У канцы 1905 — пачатку 1906 г. адбылося афармленне праваліберальнай партыі «Саюз 17 кастрычніка» (акцябрысты) і Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі (кадэты), якія падтрымлівалі «Маніфест 17 кастрычніка» і верылі ў шырокія магчымасці палітычнай дзейнасці на яго аснове. Восенню 1905 г. найбольшым быў уплыў партый рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



*I з'езд РСДРП. Мастак М. Манасзон. 1970 г.*



*Дом-музей I з'езда РСДРП. Г. Мінск*

РСДРП была абвешчана ў сакавіку 1898 г. у доме чыгуначнага служачага П. В. Румянцава ў Мінску на Захар'еўскай вуліцы (цяпер — праспект Незалежнасці).

Ад 1921 да 1923 г. у гэтым доме жыў і працаваў Янка Купала. У 1923 г. у частцы дома быў створаны музей I з'езда РСДРП. У гады Вялікай Айчыннай вайны будынак згарэў.

Музей быў адноўлены ў 1948 г., а ў 1953 г. перанесены да ракі Свіслач, дзе і знаходзіцца. Дом-музей I з'езда РСДРП з'яўляецца адным з найстарэйшых музеяў Мінска.

*Наведайце Дом-музей I з'езда РСДРП у г. Мінску або, выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:*

*1. Колькі было дэлегатаў на I з'ездзе РСДРП?*

*2. Якія сацыял-дэмакратычныя арганізацыі яны прадстаўлялі?*

*3. Якія рашэнні былі прынятыя на з'ездзе?*

*4. Чаму I з'езд РСДРП адбыўся ў Мінску?*



„Яны [прычыны рэвалюцыі] заключаліся ў парушэнні раўнавагі паміж ідэйнымі памкненнямі рускага думаючага грамадства і цяперашнімі формамі яго жыцця. Расія перарасла форму існуючага ладу. Яна імкнецца да ладу прававога на падмурку грамадзянскай свабоды“.

С. Ю. Вітэ, старшыня Камітэта міністраў Расійскай імперыі

Пра якую прычыну рэвалюцыі 1905–1907 гг. казаў С. Ю. Вітэ? Як вы лічыце, чаму ўлады не здолелі прадухіліць рэвалюцыю, хоць асобныя іх прадстаўнікі выдатна разумелі неабходнасць рэформаў?

Пачатак рэвалюцыі

**2. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. у Расіі і на тэрыторыі Беларусі.** Пачатак рэвалюцыі непасрэдна звязаны з расстрэлам **9 студзеня 1905 г.** у Пецярбурзе масавага мірнага шэсця рабочых. Яны кіраваліся да Зімняга палаца з петыцыяй аб паляпшэнні свайго становішча, у якую пад уплывам сацыялістаў былі дададзеныя палітычныя патрабаванні. Гэтая падзея адразу ж знайшла водгук на тэрыторыі Беларусі, дзе студзеньскія палітычныя стачкі ахапілі 25 гарадоў і мястэчак, у іх удзельнічала больш за 33 тыс. рабочых. У студзені 1905 г. адбыліся акцыі пратэсту ў Мінску, агульнагарадскія стачкі былі адзначаны ў Гомелі, Гродне, Брэсце, Мазыры, Ашмянах і інш.

Новы ўздым рабочага руху быў звязаны са святкаваннем 1 Мая. У красавіку — чэрвені ён ахапіў 56 гарадоў і мястэчак Беларусі, колькасць удзельнікаў палітычных забастовак дасягнула 100 тыс. чалавек. У многіх выпадках працоўныя дабіваліся скарачэння рабочага дня да 9–10 гадзін, істотнага павышэння заработнай платы.

Актывізаваўся таксама сялянскі рух. У чэрвені 1905 г. было зафіксавана 175 выступленняў. Найбуйнейшым з іх была забастоўка сялян-падзёншчыкаў і парабкаў у Навагрудскім павеце. У ліпені салдаты Баранавіцкага чыгуначнага батальёна ў Мінску

арганізавалі пратэст супраць адпраўкі іх на Далёкі Усход, дзе ў той час ішла руска-японская вайна.

**Кастрычніцкая палітычная стачка**

У кастрычніку 1905 г. арганізаваная палітычная стачка ахапіла практычна ўсю Расійскую імперыю. Актыўна яе падтрымалі чыгуначнікі — спыніўся рух цягнікоў на 26 магістралях. У Беларусі ў кастрычніцкай палітычнай стачцы бралі ўдзел каля 66 тыс. прамысловых рабочых.

**Маніфест 17 кастрычніка 1905 г.**

Для стрымлівання сацыяльных пратэстаў расійскі ўрад вымушаны быў пайсці на палітычныя саступкі. Імператар Мікалай II падпісаў Маніфест 17 кастрычніка 1905 г., згодна з якім абвяшчаліся свабоды слова, друку, сумлення, сходаў і інш., а таксама стваралася Дзяржаўная дума з заканадаўчымі функцыямі. Дзяржаўны савет фактычна ператварыўся ў верхнюю палату парламента.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*9 студзеня 1905 г.*



*18 кастрычніка 1905 г.*

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, адкажыце на пытанні.

1. *У якіх гарадах адбываліся падзеі, паказаныя на фотаздымках? Якія назвы яны атрымалі ў гісторыі?*
2. *Што звязвае абедзве падзеі? Якую ролю яны адыгралі ў ходзе рэвалюцыі 1905–1907 гг.?*

У лістападзе 1905 г. зноў актывізаваўся сялянскі рух, было зарэгістравана 154 выступленні, у снежні — 286. У гэты час прыкметна вырасла колькасць падпалаў памешчыцкіх маёнткаў, сутыкненняў з паліцыяй. Восенню 1905 г. значныя выступленні салдат адбыліся ў Гродне, Бабруйску і Брэсце. Снежаньскае паўстанне 1905 г. у Маскве знайшло пэўны водгук у Гомелі, Мінску, Пінску, Мазыры, Баранавічах, аднак да ўзброенага выступлення тут не дайшло. Пасля снежня 1905 г. рэвалюцыйны рух паступова пайшоў на спад.

Які характар (эканамічны ці палітычны) насіў сялянскі рух у гады першай расійскай рэвалюцыі?

### Спад рэвалюцыйнага руху

Узмацненне рэпрэсіўных мерапрыемстваў з боку ўрада не спыніла рэвалюцыйны рух, але значна аслабіла яго. У лютым і сакавіку 1906 г. адбыўся рэзкі спад пратэстаў рабочых. Вясной і летам 1906 г. паменшылася колькасць палітычных выступленняў у параўнанні з аналагічным перыядам 1905 г., вулічныя дэманстрацыі ўжо не праводзіліся. Сялянскія ж пратэсты ў маі — ліпені 1906 г., наадварот, узмацніліся, і іх было нават больш, чым за аналагічны перыяд 1905 г.

У другой палове 1906 г. назіраўся далейшы спад рабочага руху; у Беларусі былі зафіксаваныя толькі 3 палітычныя стачкі. Аднак выстаўленне эканамічных патрабаванняў мела для рабочых станоўчыя вынікі. У жніўні-верасні 1906 г. прыблізна ўдвая скарацілася колькасць сялянскіх выступленняў.

У пачатку 1907 г. працягнуўся спад рабочага руху. Палітычных выступленняў не было зафіксавана, а эканамічныя зрабіліся менш выніковымі. Прадпрымальнікі ўсё часцей абвяшчалі масавыя звальненні. У выніку расла колькасць беспрацоўных. Гэта сталася адным з фактараў, якія прывялі да памяншэння колькасці рабочых выступленняў і іх удзельнікаў. Толькі святкаванне 1 Мая выклікала хвалю аднадзённых забастовак.

У 1907 г. назіраліся стомленасць і расчараванне шырокіх народных мас рэвалюцыйным рухам.

**Вынікі рэвалюцыі**

**3 чэрвеня 1907 г.** Мікалай II распусціў Дзяржаўную думу і адначасова, насуперак уласнаму Маніфесту, а таксама асноўным законам Расійскай імперыі, змяніў выбарчы закон. Гэтая падзея апазіцыйнымі сіламі была расцэнена як дзяржаўны пераварот і лічыцца заканчэннем рэвалюцыі.



*Адкрыццё пасяджэння Першай Дзяржаўнай думы. 27 красавіка 1906 г.*

Пасля завяршэння рэвалюцыі 1905–1907 гг. расійскае самадзяржаўе перайшло да больш жорсткіх метадаў кіравання. Рэзка скарацілася колькасць рабочых выступленняў, стачак. Іх патрабаванні набылі эканамічны характар. У Беларусі былі разгромленыя або вельмі паслабленыя мясцовыя арганізацыі рэвалюцыйных партый. Яны не здолелі ў перыяд палітычнай рэакцыі правесці сваіх кандыдатаў на выбарах у Дзяржаўную думу. Наадварот, у гэты час большасць месцаў ад беларускіх губерняў атрымалі прадстаўнікі чарнасоценцаў і акцябрыстаў.

**БСГ — лідар нацыянальна-культурнага руху**

**3. Беларускі нацыянальна-культурны рух.** Час рэвалюцыйных падзей стаўся важным этапам самавызначэння і арганізацыйнага станаўлення беларускага нацыянальна-культурнага руху. Яго лідарам была БСГ, якая выступала на баку рэвалюцыйных сіл. У студзені 1906 г. адбыўся II з’езд БСГ, на якім партыя заявіла пра сябе як арганізацыя працоўнай беднаты Беларускага краю. У верасні 1906 г. БСГ пачала выдаваць легальную штотыднёвую газету «Наша доля», але неўзабаве газета спыніла сваё існаванне.

У лістападзе 1906 г. кіраўнікі БСГ арганізавалі выданне новай легальнай газеты «Наша ніва», якая ў далейшым адыграла выключную ролю ў развіцці нацыянальнай культуры і фарміраванні беларускай самасвядомасці. Газета выступала за нацыянальнае раўнапраўе беларускага народа. Выданне мела шырокую карэспандэнцкую сетку ва

ўсіх кутках Беларусі і за яе межамі. Вакол «Нашай нівы» аб'ядналіся аўтары розных веравызнанняў, палітычных поглядаў, якіх паяднала ідэя нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі. У газеце апублікавалі свае першыя творы многія беларускія пісьменнікі. Рэдакцыя зрабілася месцам, куды прыходзілі мастакі, вучоныя, музычныя і тэатральныя дзеячы.

У ліпені 1906 г. у вёсцы Мікалаеўшчына адбыўся нелегальны з'езд настаўнікаў Мінскай губерні, у якім актыўны ўдзел прыняў Якуб Колас. На з'ездзе народных настаўнікаў у Вільні ў маі 1907 г. быў створаны Беларускі настаўніцкі саюз, які выказаўся за дэмакратызацыю школы і выкладанне на роднай мове.

У 1906 г. у Вільні было створана беларускае выдавецкае таварыства «Наша хата», а ў Пецярбурзе — выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца», якія зрабілі вельмі шмат для пашырэння беларускай нацыянальнай культурна-асветніцкай дзейнасці.

Рэдакцыя «Нашай нівы» заклала аснову пастаяннага выдання беларускіх кніг. Як дадаткі да газеты выходзілі брашуры, зборнікі. У 1910 г. намаганнямі рэдакцыі пачаў друкавацца «Беларускі каляндар», а ў 1912 г. — часопіс «Саха». Выданне атрымала прызнанне і ўзнагароды на сельскагаспадарчых выставах у Вільні і Мінску. У 1913 г. рэдакцыя «Нашай нівы» заснавала літаратурны штомесячнік для моладзі «Лучынка», а ў студзені 1913 г. пачала выходзіць беларускамоўная штотыднёвая газета «Беларус». Рэдакцыя газеты «Наша ніва» спыніла сваю дзейнасць у 1915 г.




*Зборнік вершаў Янкі Купалы «Жалейка», выпушчаны выдавецкім аб'яднаннем «Загляне сонца і ў наша аконца»*

**Выданне беларускіх кніг**

Вызначце мэтавую аўдыторыю выданняў «Нашай нівы».

*У канцы XIX — пачатку XX ст. у Беларусі актыўна ішоў працэс утварэння палітычных партый і ўключэння шырокіх мас насельніцтва ў палітычную барацьбу. Вынікам гэтага працэсу быў шырокі ўдзел народных мас у рэвалюцыйных падзеях 1905–1907 гг., а таксама станаўленне беларускага нацыянальна-культурнага руху.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| 1900 г. — у Вялікабрытаніі заснаваная партыя Камітэт рабочага прадстаўніцтва. У 1906 г. атрымала назву лейбарысцкай, у далейшым зрабілася адной з вядучых палітычных партый краіны | 1898 г. — у Мінску створана Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (РСДРП). У 1903 г. партыя падзялілася на бальшавікоў і меншавікоў. У кастрычніку 1917 г. РСДРП (бальшавікоў) прыйшла да ўлады |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Назавіце палітычныя партыі, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Падзяліце іх на тры палітычныя лагеры: манархічны, буржуазна-ліберальны, рэвалюцыйна-дэмакратычны. Хто складаў сацыяльную базу кожнага лагера?
2. Чым, на ваш погляд, было абумоўлена з'яўленне розных палітычных партый у Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст.?
3. Складзіце стужку часу (або графік) падзей рэвалюцыі 1905–1907 гг. у Беларусі. Адзначце на ёй колькасць выступленняў, іх удзельнікаў. Прааналізуйце, калі назіраліся спады і ўздымы рэвалюцыйнага руху. Чым, на вашу думку, гэта было абумоўлена?
4. Назавіце асноўныя вынікі рэвалюцыі 1905–1907 гг. У чым былі прычыны паражэння рэвалюцыйных сіл?
5. Якія фактары паспрыялі ўздыму беларускага нацыянальна-культурнага руху напачатку XX ст.?